# РЭЧЫ

У некаторых музэях няма вітрынаў, і дазваляецца дакранацца рукамі да экспанатаў. Цяжка ўстрымацца ад гэтай спакусы: калі трымаеш у руках старажытную рэч — адчуваеш сябе амаль несьмяротным (прынамсі, старэйшым на некалькі стагодзьдзяў ці тысячагодзьдзяў). Са свайго боку, напэўна, і рэчы ня хочуць быць пахаванымі ў шкляных саркафагах. Дотык цёплай рукі ізноў вяртае іх у жыцьцё, як пацалунак прынца зь вядомай казкі — сьпячую прыгажуню. Інструмэнты нашых продкаў, якія мы бачым у этнаграфічных музэях, адпаліраваныя скурай чалавечых рук амаль па ўсёй паверхні гэтак жа гладка, як камяні, што тысячы гадоў лашчыла вада. У сучасных рэчаў гаспадар пасьпявае адпаліраваць пальцамі хіба што некаторыя клявішы. Прыкладна тое самае адбываецца і са словамі. Калісьці ў мове не было ніводнага слова, якое не пацалавалі б сваімі рыфмамі паэты. Сёньня штогод канструююцца сотні нэалягізмаў — яны ўжо амаль ня маюць шанцаў трапіць у верш альбо прымаўку. Таму і паэзія, якая калісьці была амаль тоеснай мове, цяпер выглядае нейкім архаічным спосабам мысьленьня й маўленьня.

Каштоўнасьць рэчы вымяраецца тым часам, які спатрэбіўся чалавеку (альбо чалавецтву), каб яе атрымаць. Ва ўмовах дэфіцыту кожная рэч напаўняецца сымбалічным зьместам, кожная робіць нейкую справу, патрэбную ня толькі жывым, але і нябожчыкам. Калі рэчаў мала, сьвет выглядае падобным да музэю: кожны прадмет вызваляе зь цямніцы падсьвядомасьці ўспаміны і мары, кожны мае калекцыйную каштоўнасьць. Калі рэчаў большае — яны ўжо не пасьпяваюць распавесьці нашаму воку пра свае паходжаньне і наканаваньне. У грамадзтве “агульнага дабрабыту” рэчаў зашмат, і таму надта многія зь іх выглядаюць такімі ж безаблічнымі, як выпадковае зьмесьціва сьметніцы. Цывілізацыя заможнасьці будуецца не з арыгіналаў, а з новых копіяў. У галечы ж усялякая новая рэч мае водар раскошы: для дзіцяці і першабытнага чалавека шкляная пацерка нічым ня горшая за дыямэнт.

Дэфіцыт адухаўляе ня толькі матэрыю, але і мову. Цэнзура ў таталітарным грамадзтве й табу ў першабытным забараняюць многія словы і ўчынкі, але садзейнічаюць узбагачэньню астатніх новымі сэнсамі, надаюць словам і жэстам дадатковую глыбіню й сымболіку. У маўленьні малых дзяцей і дзікуноў нашмат больш, чым у цывілізаванага чалавека, іншасказаньняў: кожны галотнік, па сутнасьці, зьяўляецца паэтам. І ня толькі на словах, але і на справе: дэфіцыт вымушае скарыстоўваць многія рэчы “мэтафарычна” — не паводле іхнага звычайнага прызначэньня.

Мова — гэта і фабрыка, і музэй нашага мысьленьня. Першы крок да таго, каб ператварыць незнаёмую рэч зь дзікае ў свойскую, — гэта даць ёй імя, пасяліць яе ў структурах мовы. Зь іншага боку, нам уласьціва рабіць некаторыя ўчынкі толькі таму, што трэба чымсьці запоўніць ужо прыдуманыя словы. Увесь навуковы і сацыяльны прагрэс можна патлумачыць жаданьнем чалавека прыручыць свае новыя думкі, ператварыць іх з выпадковых і небясьпечных у звыклыя і камфортныя.

Чалавек — адзіная істота, якая ня ведае, ці сапраўды жыве ў свой час і ў сваім целе. Мы ўпарта гойсаем па крамах альбо музэях у пошуках

*рэчавых доказаў* нашага існаваньня, але іх заўжды не стае, і ўсе яны выглядаюць не зусім пераканаўчымі, нават калі іх змайстраваць уласнымі рукамі.

У эпоху раменсай вытворчасьці рэч была адбіткам асобы свайго стваральніка, матэрыялізаваным жэстам (увесь гэты сьвет таксама разглядаўся як жэст найвышняга творцы). У эпоху канвэераў аўтары абсалютнае бальшыні рэчаў застаюцца ананімныя. Калі сэрыйная рэч і выглядае жывою, то на стадыі не вытворчасьці, а спажываньня: праз выбар той альбо іншай маркі й мадэлі пакупнік сьцьвярджае сваю індывідуальнасьць, сваю адрознасьць ад адных і салідарнасьць зь іншымі людзьмі.

Раней рэчы і словы ўвасаблялі лучнасьць чалавека з наступнымі і былымі пакаленьнямі, лад жыцьця і сьветагляд якіх амаль не адрозьніваўся. Цяпер на працягу аднаго чалавечага пакаленьня пасьпяваюць нарадзіцца й сканаць некалькі пакаленьняў хатняга начыньня (а таксама эстрадных і спартовых "зорак", партрэты якіх выціснулі з нашых сьценаў колішнія абразы). Ужо цяжка знайсьці чалавека, які б жыў на той самай зямлі, на якой нарадзіўся і дзе жылі ягоныя бацькі. Калі б ня склалі ў свой час геаграфічныя карты, то ўжо ня ведалі б, як даўней называліся многія ручаі, лясы й пагоркі. Мы кепска ўяўляем сабе рэчы, якімі карысталіся нашыя дзяды, і нічога ня ведаем пра тое, якія рэчы будуць купляць нашыя ўнукі.

Індустрыяльная рэвалюцыя вызваліла нас ад ціску жыцьцёвага досьведу папярэдніх пакаленьняў, ад маральнага і матэрыяльнага прымусу рабіць свой лёс працягам пэўнай традыцыі. Аднак мы ня сталіся праз гэта больш свабоднымі: зь вязьніцы закальцаванае вечнасьці вясковага жыцьця нас вызваліла, каб заняволіць, тыранія імгненьня. Нам лягчэй паразумецца з нашымі раўналеткамі зь іншых кантынэнтаў, чым з уласнымі бацькамі й дзецьмі.

У сьвеце хуткіх пераменаў чалавек адчувае сваёй радзімай ня той ці іншы край зямлі, а ўсю геаграфію ў пэўны адрэзак часу. Замест татуіровак свайго племя альбо нацыянальных строяў мы мусім насіць модную вопратку, замест абрадавых песень — слухаць модную музыку, кожны сэзон іншую. Ня род альбо нацыя, а міжнародная супольнасьць сучасьнікаў кантралюе нашыя паводзіны праз сусьветныя інфармацыйныя сеткі і адначасны продаж на ўсіх кантынэнтах аднолькавых тавараў. Стыль жыцьця нам дыктуе цяпер не традыцыя, а мода. І патрабаваньні яе ня менш жорсткія: грамадзтва грэбуе кожным, хто ня мае стандартнага набору модных рэчаў і думак.

У дэфіцытным, заснаваным на мітах грамадзтве кожная рэч і кожнае новае слова былі вялікай каштоўнасьцю, агульным багацьцем. Савецкі (як і першабытны) чалавек нават ня быў упэўнены, што яму належыць прадмет першай неабходнасьці — уласнае цела. Грошай было больш, чым у крамах — патрэбных тавараў, і духоўных сілаў было больш, чым прапануемых таталітарнай дзяржавай каштоўнасьцяў, на якія гэтыя сілы хацелася б патраціць. У дэмакратычных краінах усё наадварот: спэктар магчымасьцяў шырэйшы за чалавечыя здольнасьці (і пакупніцкія, і інтэлектуальныя). Адсюль і вынікае ўражаньне "здрабненьня" людзей.

Тавараў больш, чым грошай, і новых кніг больш, чым чытачоў. Нашыя сучасьнікі сьпяшаюцца спажыць як мага больш тавараў, уражаньняў, адчуваньняў — і гэта прымушае людзей сьлізгаць па паверхні быцьця: не рамантаваць пашкоджаныя рэчы, а набываць новыя, не перачытваць кнігі (прачытанае звычайна выкідаецца), ігнараваць падрабязнасьці ва ўсім, што не датычыць уласнай прафэсіі, сям'і і спосабаў патрапіць на вечны курорт пасьля сьмерці.

Неверагодна хуткая (у параўнаньні з папярэднімі стагодзьдзямі) эвалюцыя спажывецкіх тавараў падарвала рэвалюцыйны патэнцыял сацыяльных нізоў. Былых бунтароў здолелі пераканаць, што якасьць жыцьця вызначаецца якасьцю тых рэчаў, сярод якіх мы жывем. Спажывецкую ідэалёгію можна зьвесьці да наступнага тэзысу: каб зьмяніць жыцьцё да лепшага — ня трэба нічога зьмяняць у грамадзтве, у сацыяльных адносінах, дастаткова вырабляць больш дасканалыя рэчы і мець магчымасьць іх набываць. Вядомы сьлёган фірмы “Філіпс” *Let's make things better!* — зусім не выпадкова мае падвоены сэнс: “Зьменім жыцьцё да лепшага!” і “Давайце палепшым нашыя рэчы!”.

Замест таго каб шукаць лепшую будучыню для ўсіх, кожны спадзяецца купіць маленькі рай для сябе і сваёй сям'і. У заможных краінах мала каго цікавіць *res publica* (рэч паспалітая, агульная рэч), кожны думае найперш пра свае асабістыя рэчы і справы. Грамадзянская пазыцыя маніфэстуецца не на вулічных барыкадах, а ў індывідуальным чыне — у інтымным акце выбару тавараў на паліцах супэрмаркету. Патрыёт аддае перавагу таварам айчыннай вытворчасьці, нават калі яны даражэйшыя ці горшай якасьці, чым замежныя. Многія людзі прынцыпова купляюць толькі тыя рэчы, вытворчасьць і ўтылізацыя якіх ня шкодзяць экалёгіі. Можна ўявіць сабе, што вялікую палітыку ў пэрспэктыве будуць рабіць менавіта спажыўцы, а ня партыі ды прафсаюзы: прэзыдэнта краіны і дэпутатаў мы будзем выбіраць у *спэцыялізаваных крамах* — праз набыцьцё тавараў той альбо іншай маркі.

Прыручаныя і вынайдзеныя рэчы дазваляюць нам вырашыць шмат якія праблемы, але заўжды ствараюць новыя. Напэўна, лепш так, чым заўсёды мець праблемы адны і тыя ж, гэта значыць вечныя (у жывёлаў усе праблемы — вечныя). Чым большай колькасьцю рэчаў мы карыстаемся, тым хутчэй бяжыць нашае жыцьцё й сама Гісторыя. Бадай, гэта і дазволіла чалавеку ня толькі забясьпечыць сабе больш высокі стандарт жыцьця, чым у іншых прыматаў, але і засяліць ваколіцы фізычнага сьвету, у тым ліку — псыхадэлічныя царствы рэлігіяў і філязофскіх сыстэмаў.

Аднаго сьвету людзям заўсёды замала, таму і вынайшлі калісьці міты, а потым і кібэрпрастору. У снах і гульнях мы спажываем не матэрыю падзеяў і рэчаў, а толькі іхную знакавасьць, здольнасьць стымуляваць уяўленьне. (Тое ж самае датычыць набыцьця прэстыжных рэчаў і зьбіраньня калекцыяў: мы спажываем ня функцыі экспанатаў, а іхную сэмантыку, хоць можам выкарыстаць іх і паводле прамога прызначэньня.)

Цяжка сказаць, хто каму больш карысны: рэчы нам альбо мы ім. Абодва бакі могуць пераканаўча абвінавачваць адзін аднаго ў паразытызме, але найбольш карэктна нашыя адносіны можна вызначыць як сымбіёз. Зь некаторымі рэчамі мы маем больш інтымныя адносіны, чым

з бальшынёю знаёмых людзей. Мы настолькі зрасьліся з гадзіньнікам, што амаль ніколі не здымаем яго з рукі й нават бярэм з сабой у труну. Амаль што часткай цела для чалавека сталіся акуляры (альбо кантактныя лінзы), мабільны тэлефон, пасьведчаньне асобы, а таксама лекі — хімічныя рэчывы, якія дазваляюць праграмаваць паводзіны нашых органаў. Мы ўжо не ўяўляем свайго жыцьця бяз нашых інструмэнтаў, калекцый, пратэзаў. Калі людзям абяцана ўваскрашэньне — павінны ўваскрэснуць і гэтыя рэчы.

На многіх амэрыканскіх вуліцах няма ходнікаў: усё разьлічана на аўтамабілістаў, людзей з чатырохколым целам. “Амэрыканец без машыны ператвараецца ў інваліда. Без староньняй дапамогі яго чакае ледзь не галодная сьмерць” (П.Вайль, А.Геніс. *Americana*). Калі-небудзь біятэхналёгіі дазволяць чалавеку кожны сэзон мяняць органы цела на больш модныя ці лепш прыстасаваныя да новай прафэсіі, штогод іншай. Пакуль жа асалоду мець “нованароджаныя” органы нам замяняе цялесная радасьць ад нованабытых кашуляў і чаравікоў, новай мэблі і аўтамашыны.

Чалавек бяз рэчаў — няпоўны. Мы занадта груваcткія ці занадта малыя, каб зрабіць усё, што нам трэба, голымі рукамі. Зь іншага боку, чалавек занадта шырокі, занадта разумны для свайго цела — і таму думае таксама за навакольныя прадметы. Усялякая прылада для працы альбо гульні — гэта працяг чалавечага цела, але і сам чалавек — вельмі каштоўная шматфункцыянальная дэталь сваіх рэчаў: іхныя вочы, вушы, рот і многія іншыя “прыстаўныя” органы. Мы дапамагаем рэчам жыць, гэтак сама як і яны — нам. Усе гэтак званыя “рэчы-ў-сабе” — гэта папросту рэчы бяз нас. Мы бы і самі заблукалі назаўжды ў сабе, калі б нам не было чаго ўзяць у рукі: агульная вось усіх рэчаў — нітка Арыядны.

Падзею куплі-продажу невыпадкова называюць “рэалізацыяй”: толькі разам людзі й рэчы могуць стацца, адпаведна, кімсьці й чымсьці, набыць пэўны імідж, а часам і новыя функцыі ў гэтым сьвеце. Увогуле, станаўленьне нельга адасобіць ад набыцьця (не істотна, тавары мы набываем альбо рысы характару). Калі чалавек купляе што-небудзь, ён у большай ці меншай ступені набывае і самога сябе. Пад выглядам рэчаў мы спажываем, калекцыянуем альбо выкідаем на сьметнік матэрыялізаваныя імпульсы ўласнай душы. У старажытнасьці наогул не існавала супярэчнасьці паміж “быць” і “мець”, зь якой паўстала сучасная юрыспрудэнцыя: чалавек быў тым, чым ён валодаў, і разам з гаспадаром пасьля сьмерці хавалі ягоныя рэчы. Калі нехта пахавае й нас на другі дзень пасьля сьмерці Бога — гэта будзе сьведчыць пра тое, што і мы былі Яму для чагосьці патрэбныя — для працы альбо адпачынку.

У кожнай больш-менш складанай рэчы ёсьць ня толькі сваё “я”, але і “яно”: сукупнасьць былых і яшчэ магчымых функцый, якія не выкарыстоўваюцца ў гэты момант. Нічога дзіўнага, што машыны часам адмаўляюцца працаваць альбо пачынаюць рабіць невядома што пад уплывам бесьсьвядомых імпульсаў гэтак сама, як людзі (асабліва тыя, якіх вымушаюць працаваць без заробку).

Нават стандартная рэч набывае экзыстэнцыяльную глыбіню, параўнальную з чалавечай індывідуальнасьцю, калі яна выкарыстоўваецца ня толькі паводле свайго прызначэньня. Але ў сучасным сьвеце, дзе кожны

з нас штогод купляе і выкідае тысячы рэчаў, яны амаль ня маюць шанцаў паспрабаваць сябе яшчэ пры жыцьці ў новай ролі. Нават пры ня надта значных пашкоджаньнях гаспадар без усялякага шкадаваньня адпраўляе іх на перапрацоўку.

Рэчы (апрача хіба калекцыйных) трапілі, сьледам за людзьмі, у кола рэінкарнацыі: іхнае асноўнае рэчыва праз сыстэму экалягічнай утылізацыі сьмецьця можа цяпер дзясяткі разоў вяртацца на рынак у выглядзе новых тавараў з зусім іншымі функцыямі. Са свайго боку, напэўна, і людзі ўжо пачалі вяртацца на гэтую плянэту ў аблічы ня толькі традыцыйных жывых істотаў, але і новых разумных машынаў. Напрыклад, у выглядзе герояў кампутарных гульняў альбо штучных хатніх жывёлаў. Чым больш жывымі будуць рабіцца нашыя рэчы, тым хутчэй паўстане праблема адкрыцьця побач з чалавечымі могілак для загінулых робатаў ды іншых машын. Ёсьць нешта барбарскае ў тым, каб выкідаць цела амаль разумнай істоты на сьметнік.

Індустрыяльная рэвалюцыя ў свой час вызваліла прыгонных сялянаў у Эўропе й рабоў у калёніях. Сэнсам ці, прынамсі, адной з мэтаў пост-індустрыяльнае рэвалюцыі зьяўляецца вызваленьне саміх машынаў ад аднастайнае рабскае працы, ад запраграмаванай інжынэрам-“плянтатарам” функцыянальнасьці, што гэтак падобная да функцыянальнасьці чалавечага існаваньня ў таталітарным грамадзтве. Эвалюцыя тэхнікі мусіць раней ці пазьней прывесьці да нараджэньня *Абсалютнае рэчы*, якая ўжо ня будзе прыкутая да нейкай канкрэтнай функцыі, бо навучыцца для выкананьня кожнай новай задачы альбо зьдзяйсьненьня ўласнае мары адрошчваць зь сябе неабходныя органы і інструмэнты, зьмяняць у залежнасьці ад сытуацыі сваё аблічча і нават матэрыял. Немагчыма дасягнуць сацыяльнай роўнасьці паміж людзьмі, пакуль ня стануцца аднолькава каштоўнымі рэчы.